Са святам вясны, надзеі, кахання, дарагія жанчыны!



Газета заснавана ў 1938 годзе. Адноўлена ў 1997 годзе.

МАСАВА-ПАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК

Газета Слонімская

№10 (248) 6 — 13 САКАВІКА 2002Г. НАКЛАД 12.000 ЭКЗ. КОШТ 220 РУБ.

Няхай надзеі твае споўняцца
З прыходам новае вясны,
Хтосьці ў вачах тваіх утопіцца
І уваскрэсне ад красы.

Фота Віталя ГІЛЯ

Падпіска на **"Газету Слонімскую"** на другі квартал 2002 года заканчваецца 20-га сакавіка

КОШТ падпіскі на адзін месяц:

ІНДЫВІДУАЛЬНЫ	(індэкс 64042)	- **1264** руб.
ІЛЬГОТНЫ	(індэкс 63646)	- **1051** руб.
ВЕДАМАСНЫ	(індэкс 63818)	- **2191** руб.

На "Газету Слонімскую" можа падпісацца любы жыхар Беларусі.

НОВОСТИ

ПОДЕЛИЛИ ДЕНЬГИ РАЙОНА

На сессии районного Совета депутатов, прошедшей на прошлой неделе, был утвержден бюджет Слонимского района на 2002 год. По расходам бюджет предусматривается в размере 18 869,6 миллионов рублей.

Из них 8 560,7 миллиона рублей предполагается расходовать на образование. На финансирование учреждений культуры будет направлено 448,2 миллиона рублей, на здравоохранение — 4 472,6 миллиона, на развитие физкультуры — 272,9 миллиона рублей. Девяносто миллионов рублей пойдет на содержание ФК "Коммунальник" и 33,3 миллиона — на покрытие убытков киновидеопредприятия. Семнадцать миллионов выделяется на ремонт бани, 7 миллионов — на расширение городского кладбища.

Реализация специальных молодежных программ и безналичные жилищные субсидии потребуют в текущем году 6,8 миллиона рублей.

Валерий КОВАЛЕНКО

ДАЕШЬ БОЛЬШЕ ВОДКИ И СТРОЙМАТЕРИАЛОВ!

Слонимский винодельческий завод собирается разнообразить свою продукцию вводом в действие линии по разливу вина в бутылку объемом 0,7 литра, — так называемый "фауст".

Кроме того, местные ликероводочные производители в 2002 году планируют увеличить выпуск горячительных напитков более чем вполовину к уровню прошлого года — 166,7 процента. Цифра впечатляющая, если учесть, что следующими в тройке лидеров по планируемым темпам роста идут производители стеновых материалов (116,4%) и пиломатериалов (108,4%).

Динамика промышленного роста, кстати, предусматривается на всех двадцати семи предприятиях Слонима и утверждена на сессии райсовета депутатов. Только одному предприятию — ОАО "Слонимский льнозавод" — официально запланировано уменьшение промышленного производства в 92,2 процента к уровню прошлого года. Возможно, это связано с сокращением сельскохозяйственных угодий, которых, согласно "Прогнозу социально-экономического развития Слонимского района на 2002 год", должно стать на 2 120 гектаров или на 3,3% меньше к их общему наличию на сегодняшний день.

Валерий КОВАЛЕНКО

НАШЕ ИНТЕРВЬЮ

Мечислав Костюк: НЕ ДАЙ БОГ, ЧТОБЫ Я В КОМ-НИБУДЬ ОШИБСЯ



Мечислав Костюк

С 11 февраля председателем Слонимского райисполкома утвержден Мечислав Костюк. Три недели в новой должности — срок небольшой, но тем не менее, было время познакомиться с городом, его жителями, проблемами и нуждами.

Свой взгляд на некоторые вопросы жизни Слонима и района Мечислав Костюк высказал в разговоре с корреспондентом "ГС".

— Мечислав Брониславович, Владимир Савченко, представляя Вас слонимским депутатам, заметил, что кандидатуры, лучше Вашей, нельзя было и придумать. Значит назначение в Слоним неожиданностью для Вас не было. Было время собрать сведения о Слониме и районе, проанализировать статистику, отметить что-то хорошее и определить проблемные направления. Какое впечатление о Слониме сложилось у Вас еще с областной высоты?

(Продолжение на 12 стр.)

ЭКАНОМІКА

ДАПРАЦАВАЛІСЯ ДА ТАГО, ШТО СЛОНІМ ПАКІДАЮЦЬ БАНКІ



Фота Віталя ГІЛЯ

15 сакавіка гэтага года Слонімскі філіял "Приорбанк" спыніць сваю дзейнасць і будзе зачынены. Такое рашэнне было прынята Наглядальным саветам "Приорбанка" па рэкамендацыі Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця, які валодае блакіруючым пакетам акцый.

Справа ў тым, што па выніках даследаванняў спецыялістаў дзейнасць філіяла 0603 "Приорбанка" на тэрыторыі Слоніма і раёна прызнана эканамічна немэтазгоднай. Эксперты прызналі, што наш рэгіён у сённяшняй сітуацыі не мае эканамічнай перспектывы для развіцця.

Як сказаў карэспандэнту "ГС" упраўляючы слонімскім філіялам "Приорбанка" Аляксей Матач, філіял працаваў рэнтабельна, меў прыбытак, аднак банк — гэта інвестыцыі, а на цяперашні час інвестыцыйны клімат у рэгіёне — нулявы. Таму, як банкір, ён лічыць, што Наглядальны савет прыняў правільнае, рашэнне, хаця ў гэтым накірунку на месцы было зроблена шмат. Таму нічога не застанецца, як прыйдзецца звольніць 22 работніка банка, а новы будынак філіяла будзе вы-стаўлены на продаж.

Дарэчы, падобныя філіялы "Приорбанка" будуць зачынены таксама ў Ваўкавыску, Івацэвічах, Белаазёрску, Светлагорску і іншых гарадах рэспублікі. А ў чэрвені па Беларусі пройдзе другі этап закрыцця філіялаў "Приорбанка". Аляксей Антонавіч не выключае, што на падобны крок вымушаны будуць пайсці і іншыя беларускія банкі.

Адзначым, што па ацэнцы Еўрапейскага банка, па ўзроўню прагрэсу ў вобласці рэфармавання эканоміка нашай краіны знаходзіцца на 25-м месцы сярод 26 краін з пераходнай эканомікай. У сусветным масштабе па прывабнасці капіталаўкладанняў Беларусь займае 135-е месца, а па ўзроўню эканамічных свабод — 148-е.

Віктар ВАЛАДАШЧУК

СОБЫТИЕ

НА СТРАЖЕ УКАЗОВ ПРЕЗИДЕНТА

Торжественное собрание в честь Дня милиции виновники праздника провели заблаговременно, за три дня до юбилейной даты — 4 марта.

Само торжество 85-летия белорусской милиции прошло в Слониме намного скромнее недавнего Дня защитника Отечества, и людей, пожелавших поздравить милиционеров с профессиональным праздником, было не в пример меньше.

Но свою дозу поздравлений от официальных лиц блюстители правопорядка все же получили. Ярослав Халецкий, начальник Слонимского ОВД, углубился в историю, не обойдя в то же время и день сегодняшний, — отметил, что сегодня "основные усилия сосредоточены на выполнении указов и декретов президента Беларуси". А председатель райисполкома Мечислав Костюк выразил уверенность, что и впредь "работа органов внутренних дел будет на первом месте. И все те проявления, которые пока еще имеют место на территории нашего района, будут пресекаться работниками внутренних дел совместно с трудовыми коллективами, и наши люди будут спать спокойно, как это говорит добрая народная мысль".

Позже по хорошей народной традиции ряд милицейских чинов и приглашенных цивильных людей по случаю юбилея сели за праздничный стол.

Валерий КОВАЛЕНКО

ОПРОС

"8 МАРТА - СВЕТЛЫЙ ПРАЗДНИК ВЕСНЫ"

8 Марта — Международный женский день. А вот считают ли женщины этот день, действительно, праздником?

Лариса Притулик и Елена Радкевич:

— Конечно, да. Это наш самый любимый праздник. Мужья нам дарят цветы. В гости приезжают друзья, вечером мы готовим шашлыки. 8 Марта и Новый год — у нас самые любимые праздники.

Елена Хавтур и Елена Гарбар:



— Безусловно, это для нас праздник. В этот день мы ходим в гости, дарим друг другу подарки.

Наталья Рабцевич:

— Да, конечно, 8 Марта, как и для любой женщины, — это праздник. Мы все, женщины, ждем его с нетерпением.

Жанна Зимницкая:

— Женский день, лично для меня — это ожидаемый праздник. С ним меня поздравит любимый человек и ребенок.

Наталья Мокрецкая:

— Для меня этот день — самый обычный, не праздничный. 8 марта мне придется работать. И вообще, я не чувствую этого праздника.

Анна Черкашина:

— Конечно, это праздник, причем хороший и светлый. Праздник весны. И мне он нравится.

Ольга ШИНКЕВИЧ, Виталий ГИЛЬ (фото)

Курсы обмена валют в г.Слониме по состоянию на 5 марта 2002г.

	Покупка	Продажа
"Приорбанк"		
1 USD	1665	1710
1 EURO	1400	1490
1 RUR	53	55
"Беларусбанк"		
1 USD	1670	1700
1 EURO	1440	1480
1 RUR	53	55
ОА "Белпромстройбанк"		
1 USD	1670	1695
1 EURO	1430	1465
1 RUR	53	55
"Белагропромбанк"		
1 USD	1660	1695
1 EURO	1430	1460
1 RUR	53	55
Нацбанк РБ		
1 EURO	1446,14	

НАВІНЫ

ТЭЛЕПЕРАДАЧА ПРА ТЭАТР

У мінулыя нядзелю і панядзелак Беларускае тэлебачанне здымала ў Слоніме перадачу пра мясцовы беларускі драматычны тэатр.

У ёй будзе ісці размова пра сённяшнія будні тэатральнага калектыву, яго праблемы і здабыткі, а таксама гледачы ўбачаць урыўкі з новых спектакляў, гутаркі з акцёрамі. Пэўны час перадачы будзе адведзены і гісторыі тэатральнага мастацтва на Слонімшчыне, пачынаючы з часоў Міхала Агінскага.

Тэлеперадача пра тэатр у Слоніме будзе паказана па БТ 27 сакавіка на Міжнародны дзень тэатра.

Сяргей ЧЫГРЫН

Газета Слонімская
7 — 13 сакавіка 2002г. №10 (248)

НАВІНЫ

ЛУЧШИЕ ПРЕДПРИНИМАТЕЛИ СЛОНИМА

1 марта в Гродно прошел конкурс "Лучший предприниматель 2001 года".

Инициатором конкурса стал областной региональный комитет предпринимательства и инвестиций совместно с облисполкомом.

Первое место в номинации "Организация производства в сфере среднего предпринимательства" занял индивидуальный предприниматель Роман Гиль.

Второе место в номинации "Организация торговли в сфере малого предпринимательства" присуждено предпринимателю нашего города Юрию Адамчуку.

В номинации "Субъекты инфраструктуры поддержки предпринимательства" второе место занял центр поддержки предпринимательства слонимского общества с ограниченной ответственностью "Автошкола". Генеральный директор которого – Валерий Выжеговский (директором слонимского центра поддержки предпринимательства является Сергей Казицкий). Победителям были вручены дипломы и ценные призы.

Ольга ШИНКЕВИЧ

І Ў НОВЫМ ГОДЗЕ ЗЛОДЗЕЯЎ НЕ МЕНШ

Як паведаміў начальнік слонімскага райаддзела ўнутраных спраў палкоўнік міліцыі Яраслаў Халецкі, за студзень-люты 2002 года па Слоніму і раёну зарэгістравана 96 злачынстваў.

З іх семдзесят адно – па лініі крымінальнага вышуку. Дванаццаць злачынстваў засталіся нераскрытымі. Пачатак года ў крымінальным плане несуцяшальны. Калі гэтак пойдзе і далей, – а пік злачыннасці выпадае на лета, – то паказчыкі мінулага года (538 злачынстваў) будуць перавышаны.

Валерый КАВАЛЕНКА

ПОСОБИЕ – ОКОЛО 8 $

На сегодняшний день в Слонимском региональном центре занятости на учете состоит 860 человек.

Из них 442 человека каждый месяц получает пособие по безработице. Средний размер пособия составляет 13452 рубля.

В прошлом году в региональном центре занятости было зарегистрировано 2345 человек, 1839 слонимчан было трудоустроено на постоянную работу.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ЗДАРЭННІ

РТУТЬ НЕ УСПЕЛА НАВРЕДИТЬ

В воскресенье, 3 марта, в Слониме в жилом доме по ул. Воссоединения был разбит ртутный термометр отопительного котла.

Прибывшие на место происшествия сотрудники пожарной аварийно-спасательной части №3 собрали на месте около 10 граммов ртути.

Ольга ШИНКЕВИЧ

ЗАСТРЭЛІЎСЯ Ў СВАЁЙ КВАТЭРЫ

На мінулым тыдні з самаробнай зброі застрэліўся 46-гадовы жыхар з Тапалёвай вуліцы.

Што падштурхнула мужчыну пайсці на такі трагічны ўчынак, разбіраюцца праваахоўныя органы. Вядома толькі, што слонімец прыйшоў дамоў, зачыніўся ў пакоі, лег на ложак і стрэліў сабе ў галаву. А напярэдадні, 27 лютага, скончыў жыццё самагубствам 47-гадовы мужчына, які жыў на вуліцы Агінскага. Ён павесіўся. Абставіны трагедыі высвятляюцца.

Валодзя ЯНЧУК

ИНТЕРВЬЮ

СЛУЖИТЬ В ГАИ БУДУТ ТОЛЬКО ОФИЦЕРЫ



Начальник слонимского отделения ГАИ Василий Супрун

В ближайшее время в Беларуси будет проведена реформа в системе государственной автоинспекции МВД. В связи с этим, корреспондент "ГС" обратилась к начальнику слонимской ГАИ Василию Супруну за комментариями.

— Василий Николаевич, что Вы думаете по поводу предстоящей реформы в ГАИ?

— Суть реформирования заключается в том, что до 2005 года в нашей республике планируется перевести весь инспекторский состав с сержантского на офицерский ДПС ГАИ.

— А какова дальнейшая судьба сержантов, старшин?

— Сержантам сейчас предложено поступать в высшие учебные заведения. У нас есть школы милиции в Барановичах и в других городах республики. В этом году уже 5 человек поступили в ВУЗы.

— А сколько сейчас офицеров на службе в слонимском отделении ГАИ?

— На сегодняшний день в нашем отделении 32 человека, из них 17 инспекторов дорожно-патрульной службы – сержанты и 15 человек – офицеры.

— С каких городов начнется реформирование ГАИ?

— Уже в этом году реформа будет проведена в Минске. В 2003 – 2004 году реформирование ГАИ пройдет во всех областных центрах, а к 2005 году – в районных городах.

— Кроме того, руководство ГАИ МВД планирует прекратить практику взимания штрафов работниками ГАИ. Что Вы думаете по этому поводу?

— Да, это тоже предполагается сделать. На Украине уже была практика взимания штрафов через суды, но через несколько месяцев они вернулись к прежней системе. Потому что суды были буквально завалены протоколами. Представьте себе такую ситуацию: инспектора ГАИ за год выявляют 30 тысяч нарушителей, и это значит, что всем этим людям нужно будет прийти в суд. Или, например, в сутки в среднем – 60 нарушителей правил дорожного движения, значит 60 человек должны будут предстать перед судом.

— Реформа ГАИ также предполагает "повсеместное внедрение технических средств контроля"... В Ваше отделение подобная техника поступала?

— Пока нет.

— А новый радар?

— Три измерителя скорости "Сокол" наш отдел приобрел своими силами.

Ну, а те обещанные средства контроля будут сначала внедрять в крупных городах. Например, в Кобрине уже есть станция диагностики. Она стоит 60 тысяч долларов и предназначена для проверки технического состояния транспорта и проведения технических осмотров. В Минске уже имеются четыре служебные автомашины ГАИ, оснащенные современным оборудованием контроля скоростного режима и видеодокументирования нарушений. Но эта техника стоит очень дорого.

Ольга ШИНКЕВИЧ

МЕДЫЦЫНА

КУДЫ ЗНІК АДДЗЕЛ ПА ВЫРАБУ ЛЯКАРСТВАЎ?

У рэдакцыю нашай газеты пазваніла сланімчанка Надзея Сяргееўна Чарных з вуліцы Пушкіна і запытала: чаму ў цэнтральнай аптэцы № 61 ліквідавалі аддзел па вырабу лякарстваў (каплі для вачэй, парашкі, мікстуры і г.д.)?



У чарзе па лякарствы ў Слонімскай цэнтральнай аптэцы № 61

І, сапраўды, чаму? Ва ўсіх гарадах Гродзенскай вобласці такія лякарствы выробляюць у першую чаргу цэнтральныя аптэкі. А слонімцам цяпер па каплі для вачэй прыйдзецца ездзіць у аптэку № 108, якая знаходзіцца на вуліцы Скарыны. Гэтае пытанне карэспандэнт "ГС" адрасаваў загадчыцы цэнтральнай аптэкі № 61 Алене Курцэвіч. Алена Паўлаўна сказала:

"Наша аптэка знаходзіцца ў старым будынку, хаця некалі ішла размова аб пераносе аптэкі ў раён Дома Саветаў, але гэтага не атрымалася. Таму яна мае не вельмі добрыя ўмовы для вырабу лякарстваў па рэцэптах, асабліва для ўстаноўкі аўтаклаву – апарата для стэрылізацыі капель для вачэй. Аптэка на вуліцы Скарыны ў сваю чаргу месціцца ў новым памяшканні, больш прыстасаваным і свабодным. Менавіта гэтая аптэка атрымала ліцэнзію ў вобласці на выраб капель для вачэй. Яна і будзе іх рыхтаваць. Астатнія лякарствы вырабляе аптэка № 129 на вуліцы Чарняхоўскага. Дарэчы, цэнтральная аптэка ў апошні час абслугоўвае людзей, якія карыстаюцца бясплатнымі льготнымі рэцэптамі. Абслугоўванне гэта стала больш жорсткім, сур'ёзным, таму каля нашых прылаўкаў з'явіліся чэргі. У месяц мы абслугоўваем 2800 такіх льготнікаў, а па выраб лякарстваў у дзень звяртаюцца каля 11 чалавек. Таму вялікай бяды тут няма, калі ў цэнтральнай аптэцы знік аддзел па вырабу лякарстваў, а з'явіўся ён у аптэках №№ 129 і 108".

З Аленай Паўлаўнай можна пагадзіцца. Але як зразумець тых людзей, асабліва пенсіянераў, якім, напрыклад, трэба па гэтыя каплі ехаць на вуліцу Скарыны з вуліцы Пушкіна, з Рышчыц, з Альбярціна. Толькі за праезд у гарадскім аўтобусе яны заплоцяць у два разы больш, чым каштуюць тыя каплі. Раней жа іх выраблялі ў цэнтральнай аптэцы, і людзям было вельмі зручна заказаць гэтыя лекі.

А вяскоўцам як быць? Паспрабуй яшчэ знайсці тую ж аптэку № 108. Загадчыцы аптэк №№ 129 і 108 Ліна Коршун і Таццяна Новік шчыра прызналіся, што лепш было б, каб каплі для вачэй, мікстуры, парашкі рыхтаваліся ў цэнтральнай аптэцы. Ды і людзі вельмі незадаволеныя гэтым новаўвядзеннем.

Што датычыць сельскіх аптэк Слонімскага раёна, дык усе яны пераведзены на аптэкі гатовых лекавых форм. "Аптэка ў Міжэвічах, – сказала яе загадчыца Надзея Рэкун, – калі абслугоўвала бальніцу, выраблялa такія лякарствы, а цяпер ужо не. Па іх трэба ехаць у Слонім".

Вядома, час у фармацэўтыцы не стаіць на адным месцы. І лепшым зыходам усіх гэтых маленькіх і вялікіх праблем было б тое, каб усе неабходныя лякарствы людзі маглі купіць у гатовым выглядзе.

Сяргей ЧЫГРЫН

БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ

ШАСЦЁРА ДЗЯЦЕЙ ЗАСТАЛІСЯ СІРОТАМІ

У 1998 годзе жыхарка вёскі Акунінава Слонімскага раёна Раіса Мурашова першы раз была пазбаўлена бацькоўскіх правоў на чатырох сваіх непаўналетніх дзяцей. Лену, Алега, Марту і Івана забралі з дому ў розныя сіроцкія дзіцячыя ўстановы.


А ў іх мамы і яе сужыцеля Анатоля Фаменкі хутка нараджаюцца па-за шлюбам яшчэ дзве дачкі: у 1999 годзе – Паліна, і ў 2001-ым – Каця. Але нараджэнне і гэтых дзяцей не сталася шчасцем для іх бацькоў.

З матэрыялаў справы "Аб адабранні дзяцей у Мурашовай Р.Г." і з рашэння суда аб пазбаўленні жанчыны (другі раз) бацькоўскіх правоў паўстае такі малюнак. У хаце, дзе жывуць Мурашова і Фаменка, у самы разгар зімы не было электрычнасці – адключылі за няўплату, адсутнічалі дровы. У жылых пакоях былі выяўлены бруд, беспарадак, антысанітарыя. Бацькі злоўжывалі алкаголем і амаль не клапаціліся пра дзяцей. Становішча ў гэтым доме было настолькі крытычным, што пагражала не толькі здароўю, але і жыццю сясцёр. Таму рашэннем органа апякунства ад 16 студзеня бягучага года Паліна і Каця былі адабраны ў Раісы Мурашовай і на некаторы час змешчаны ў дзіцячае аддзяленне Слонімскай райбальніцы (аб гэтым "ГС" пісала ў №7 за 2002 год). А хутка адбыўся выязны суд і прынята рашэнне аб пазбаўленні Раісы Мурашовай бацькоўскіх правоў на Паліну і Кацю, а таксама аб прызначэнні Мурашовай аліментаў на карысць органа апекі ў памеры 33% даходу на непаўналетніх дзяцей. Гэтае рашэнне ўступіла ў законную сілу 18 лютага. Паліна і Каця, як і чацвёра іх старэйшых братоў і сясцёр, засталіся сіротамі пры фактычна жывых бацьках і накіраваны ў дзіцячы дом.

Мікола КАНАНОВІЧ

ПРЫРОДНЫЯ КАТАКЛІЗМЫ

ГРОМ З МАЛАНКАЮ НАД СЛОНІМАМ



У сераду, 27 лютага, у Слоніме прайшла навальніца з громам і маланкаю.

Падобная з'ява прыроды назіралася і ў іншых гарадах і вёсках Беларусі. Нават у Белгідраметэацэнтры адзначылі, што прадказаць такія навальніцы зімою ў Беларусі вельмі цяжка, хаця ў Польшчы і Германіі сёлета ў лютым яны прайшлі ўжо па некалькі разоў.

Пра падобныя з'явы прыроды ў народным календары запісана, што "люты вады падпусціць, а сакавік падбярэ", альбо "калі зімой загрыміць гром – будуць буры". У навальніцы з громам і маланкаю людзі найперш бачылі прарочы знак, што летам прападуць пожні. Гром у лютым нібыта папярэджваў сялян магчымай сваёй карай у адказны для земляроба час. Але як будзе сёлета – дажывем, пабачым.

Сяргей ЧЫГРЫН

МАСТЫ

У ГУДЗЕВІЦКІМ МУЗЕІ НОВАЯ ЭКСПАЗІЦЫЯ

У Гудзевіцкім літаратурна-этнаграфічным музеі адкрыта новая выстава ткацкай творчасці. Аснову экспазіцыі складаюць сурвэткі, настольніцы, падвойныя дываны, паясы і іншыя вырабы Гродзенскага абласнога палаца дзіцячай і юнацкай творчасці.

Узрост юных ткачых ад 10 да 14 гадоў. Самай старэйшай 16. Ёсць таксама і калектыўныя працы. Узначальвае гурток ткачых Марына Камінская, дачка заслужанага дзеяча культуры РБ, загадчыка музея Алеся Белакоза. Любоў да гэтага забытага народнага рамяства Алена Аляксандраўна пераняла ад маці, якая першай у нашым краі адрадзіла ткацтва падвойных дываноў. Упрыгожваюць выставу паясы, якія выткалі вучні мясцовай школы, удзельнікі гуртка, што ўзначальвае Вера Белакоз.

Язэп ПАЛУБЯТКА

НЕ ХАПАЕ ДАКТАРОЎ

Згодна слоў галоўнага ўрача Мастоўскага раёна Міхаіла Собаля, у раённай сістэме аховы здароўя не хапае 20 дактароў.

Няма ўрачоў у Мілявіцкай, Рагозніцкай, Харціцкай амбулаторыях. Не хапае ўрачоў у Курылавіцкай участковай бальніцы. У самой раённай бальніцы няма рэнтгенолага, псіхатэрапеўта, трох хірургаў, анестэзіёлага-рэаніматара, урачоў-рэабілітолагаў, стаматолагаў і дактароў іншых спецыяльнасцей.

Антон МАКЕЙ

НЯМА ЧЫМ ПЛАЦІЦЬ

У некалі перадавым калгасе імя Адама Міцкевіча няма чым плаціць за электраэнергію.

Пастаянная запазычанасць перад электрыкамі змусіла апошніх адключыць ад святла кантору гаспадаркі.

Антон МАКЕЙ

ПРЫЙШОЎ НА СХОД – АТРЫМАЙ ДЗВЕ ТЫСЯЧЫ

Ва ўнітарным сельгаспрадпрыемстве "Мастаўчанка" адбыўся справаздачна-выбарчы сход.

Тыя вяскоўцы, якія прыйшлі на сход, атрымалі па дзве тысячы рублёў. Некалькім перадавікам далі прэміі у памеры аж дзесяць тысяч рублёў.

Антон МАКЕЙ

ПРАДПРЫМАЛЬНІКАМ СТАВЯЦЬ УМОВЫ

Мастоўскі райвыканкам прапгвае рээрганізацыю гандлёвых кропак для прадпрымальнікаў.

Іх намагаюцца перавесці з цэнтра горада ў іншыя месцы. Робіцца гэта дзеля таго, каб пакупнікі часцей заходзілі ў крамы спажывецкай кааперацыі, якія знаходзяцца побач. Частка месцаў выдзелена ля міні-рынку, побач з СШ№1. 18 месцаў адведзена па праспекце Юнацтва, непадалёку ад касцёла. Тым, хто пагадзіцца там гандляваць, пастаўлены ўмовы: шапік павінен быць стандартнай формы. Набыць яго прадпрымальнікі абавязаны толькі ў адной з мінскіх фірмаў, але адзін толькі яго каркас каштуе 1700 даляраў.

Антон МАКЕЙ

ДРЭВА "ПЕРАБЕГЛА" ДАРОГУ

П'яны мастаўчанін К. перадаў кіраванне ўласным аўтамабілем "Жыгулі" другому мастаўчаніну, у якога не было правоў.

Апошні не справіўся з кіраваннем і сутыкнуўся з дрэвам насупраць часці МЧС. Пры гэтым атрымала няэначныя цялесныя пашкоджанні жанчына, якая праходзіла побач.

Антон МАКЕЙ

ІНТЭРВ'Ю

НАСТАЎНІКУ ПАТРЭБНА ПАВАЖАЦЬ У ВУЧНЮ АСОБУ



Напярэдадні першага свята вясны, Міжнароднага жаночага дня, мы завіталі ў госці да вядомай настаўніцы Зэльвеншчыны Ірыны Уладзіміраўны Генюш. Ірына Уладзіміраўна — выдатнік народнай асветы, настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай катэгорыі і проста цудоўная жанчына. Яе вучні неадназова займалі пераможныя месцы на алімпіядах раёна, вобласці і нават рэспублікі. 38 гадоў яна аддала настаўніцкай працы і цяпер знаходзіцца на заслужаным адпачынку.

— Ірына Уладзіміраўна, адкуль да Вас прыйшло жаданне стаць настаўніцай?

— Я вырасла ў вёсцы Марачы Зэльвенскага раёна. Для нас, вучняў пасляваенных гадоў, настаўнікі былі прыкладам ва ўсім. Мне яны ўвогуле здаваліся незямнымі істотамі. Я адразу вырашыла, што буду настаўніцай. У 1953 годзе паступіла ў Ваўкавыскае педвучылішча, а праз дзесяць год — на завочнае аддзяленне ў Гродзенскі педагагічны інстытут.

— Ці памятаеце Вы свой першы ўрок?

— Памятаю, колькі хвалявання, няўпэўненасці, страху было ў душы на першым уроку, які давала на педагагічнай практыцы ў навагрудскай школе. Потым з кожным новым урокам адчувала сябе больш упэўненай, раскаванай.

— Якімі прынцыпамі Вы карысталіся пры падрыхтоўцы да ўрокаў і пазакласных вечарын?

— Я дзевяць год працавала метадыстам у раённым аддзеле народнай адукацыі і пабачыла шмат цікавых урокаў. Гэта было сапраўднай скарбонкай для мяне. Аднак, я не імкнулася капіраваць, заўсёды была ў пошуку, многа чытала, шукала штосьці новае, да ўрокаў падыходзіла творча. Пазакласную работу звязвала з Зэльвеншчынай, з беларускімі народнымі традыцыямі.

— Што Вы лічыце галоўным у адносінах настаўніка і вучня?

— Настаўніку найперш трэба паважаць у вучню асобу. Ніколі нельга крычаць. Калі настаўнік сыходзіць да крыку, то ён праяўляе сваю слабасць. І яшчэ адно: дрэнны настрой настаўнік не павінен вымяшчаць на сваіх вучнях, усе свае праблемы, хваробы мы павінны пакідаць за дзвярыма школы.

— Кім зараз працуюць Вашы былыя выпускнікі?

— Касманаўтам ніхто не стаў. Аднак, аналізуючы тыя класы, дзе была класным кіраўніком, заўважаю, што нікога ніколі не бачыла ў непрыстойным выглядзе. Сярод маіх вучняў ёсць і рабочыя, і інжынеры, і ўрачы, і настаўнікі, і выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў.

— Ведаю, што Вы ахвотна дзяліліся сваім настаўніцкім вопытам...

— Так, я чытала лекцыі на курсах удасканалення настаўнікаў, знаёміла педагогаў са сваімі распрацоўкамі, двойчы прымала ўдзел у дзяржаўных камісіях на ўступных экзаменах у Гродзенскім медінстытуце, друкавалася ў часопісе "Беларуская мова і літаратура", артымала срэбраны медаль на ВДНГ за працу з моладдзю.

— Ірына Уладзіміраўна, Вы трыццаць восем гадоў настаўнічалі. Мабыць, было нямала цікавых выпадкаў. Раскажыце што-небудзь.

— Я даўно пачала выпісваць з вучнёўскіх сачыненняў смешныя ўрыўкі. У адным сачыненні вучань піша: "На карціне Васняцова мы бачым трох асілкаў: Ілью Мурамца, Алёшу Паповіча і Алега Пятровіча..." Алег Пятровіч працаваў настаўнікам фізкультуры ў нашай школе і быў мужчынам моцнага целаскладу. Быў яшчэ такі выпадак. На ўроку беларускай літаратуры разглядалі твор К.Чорнага "Трэцяе пакаленне". Я тлумачу вучням: "Не ў золаце шчасце. Я колькі год жыву без залатых пярсцёнкаў ды завушніц." На гэта мне адзін вучань парыраваў: "А ў роце ў вас што робіцца?", маючы на ўвазе зубныя каронкі.

— Настаўніцкая праца патрабуе шмат энергіі, духоўнай і фізічнай сілы. Адкуль Вы чэрпалі ўсё гэта?

— У сваёй уласнай сям'і. Мяне заўсёды падтрымлівалі мой муж і трое дзяцей. Іншы раз прыйдзеш з працы стомленая, разбітая, а муж трапна пажартуе, рассмяшыць. Я сваім дзецям удзяляла не столькі ўвагі, колькі хацелася б. Але яны ўсё разумелі і дапамагалі мне. Дамашняя цеплыня — вось тая крыніца, якая давала мне зарад бадзёрасці і аптымізму.

— Скажыце, калі ласка, з якімі цікавымі людзьмі сутыкаў Вас лёс?

— Я асабіста была знаёма з Ларысай Геніюш, Аляксеем Карпюком, сустракалася і падтрымлівую сувязь з Юркам Голубам, Міхасём Скоблам, цёплыя адносіны захавалія ў мяне з Аленай Руцкай.

— Ірына Уладзіміраўна, чым займаецеся на заслужаным адпачынку?

— Калі шчыра, дык на адпачынак часу не хапае. У мяне двое ўнукаў заканчваюць школу, і я рыхтую іх да паступлення. На пенсіі я даведалася шмат чаго новага. Сачу за навінкамі ў літаратуры, шмат чытаю. Мяне запрашаюць да ўдзелу ў літаратурных вечарынах, якія ладзіць раённая бібліятэка. У вольную хвіліну вяжу, вышываю рушнікі — рыхтую пасаг унукам. Вясною мяне чакае праца ў кветніку. Я вельмі люблю ружы і вырошчваю іх. Увогуле, люблю працаваць на зямлі. Я ўжо сёмы год знаходжуся ў адпачынку, але яшчэ адчуваю сябе патрэбнай людзям.


Наталля ГЛУШЭНЯ, Зэльва

ГРОДНО

ГОРИСПОЛКОМ ОТКАЗАЛ В РАЗМЕЩЕНИИ ИЗДАНИЯ "ГАЗЕТА "ПАГОНЯ"

Гродненский горисполком отказал редактору закрытой властями газеты "Пагоня" Николаю Маркевичу в размещении в городе нового издания под названием "Газета "Пагоня".

В ответе на просьбу о согласовании размещения издания, полученном Маркевичем 27 февраля, в частности, говорится: "Горисполком принял во внимание, что название данного издания практически идентично названию газеты "Пагоня", выпуск которой был прекращен решением Высшего хозяйственного суда Республики Беларусь и главным редактором которой был тот же гражданин Н.Н. Маркевич. В новом варианте в название вошло слово "газета". Городской исполнительный комитет считает, что стремление зарегистрировать издание "Газета "Пагоня" является попыткой обойти решение Высшего хозяйственного суда и возобновить издание под другим, но абсолютно созвучным названием". Исходя из этого, горисполком решил отказать в размещении "Газеты "Пагоня" в городе Гродно.



ПАГОНЯ

Так сегодня выглядит электронный вариант "Пагоні"

Николай Маркевич заявил, что он намерен подать документы о согласовании размещения новой газеты — "Мужыцкая праўда". "Это историческое название газеты, издававшейся в XIX веке Кастусем Калиновским, как нельзя более подходит к нынешним временам, — считает он. — Лично для нас, журналистов газеты "Пагоня", ситуация почти идентична той, в которой находились Калиновский и его соратники в позапрошлом веке".

Против Маркевича и журналиста закрытой газеты "Пагоня" Павла Можейко выдвинуто обвинение в клевете в отношении президента Беларуси. Им угрожает лишение свободы сроком до 5 лет. Николай Маркевич также намерен обжаловать действия городских властей в суде. По его мнению, отказ в размещении газеты незаконен. "Незаконным является и первоначальное решение о закрытии газеты "Пагоня", принятое судьей Высшего хозяйственного суда Валерием Жандаровым 12 ноября 2001 года. Оно, в свою очередь, инициировало абсолютно незаконное уголовное преследование и продолжает оказывать давление на сознание местных чиновников", — считает Маркевич. 27 февраля он и Можейко подали в прокуратуру Гродненской области ходатайства о прекращении уголовного дела в связи с отсутствием состава преступления.

Геннадий БАРБАРИЧ

ГРОДНО

"КАЛЫСКА" БЕЛАРУСКАГА САМАКІРАВАННЯ

Гродзенскае аддзяленне грамадскага аб'яднання "Маладая грамада" пры падтрымцы Фонда Эберта правяло маладзёжную сустрэчу па тэме "Гісторыя мясцовага самакіравання".

У сустрэчы прымалі ўдзел сябры "Маладой грамады", "Маладога фронту", незалежнага прафсаюзу "Азот", а таксама студэнты Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта. На сустрэчы выступаў сп. А. Завадскі, прадстаўнік Фонду імя Льва Сапегі – арганізацыі, якая займаецца пытаннямі мясцовага самакіравання.

Гродзенскае самакіраванне – адно са старэйшых у Беларусі. Гродна атрымаў Магдэбургскае права другім горадам пасля Брэста і зараз па праву лічыцца "калыскай" беларускага самакіравання. Аналізуючы сітуацыю, якая існуе зараз на Гарадзеншчыне, удзельнікі сустрэчы прыйшлі да высновы, што самакіраванне ў сённяшні дзень у Гродзенскай вобласці не існуе. Па словах арганізатаркі Святланы Нех, "людзі павінны мець права голасу ў вырашэнні праблемаў, якія датычацца іх жыцця: ці то гэта пытанне, дзе пакласці асфальт, ці то пытанне, хто кіруе краінай. Увосень мы ўсе чакалі нейкай рэвалюцыі, але зараз разумеем, што ўсе вялікія змены робяцца паступова. Ініцыятыва павінна ісці знізу, ад саміх людзей, ад мясцовага самакіравання. Таму зараз, напярэдадні выбараў у мясцовыя саветы многія арганізацыі вобласці сур'ёзна абмяркоўваюць удзел у гэтых выбарах".

Святлана АЛЕШКА

В ГРОДНО ГОТОВИТСЯ ЗАБАСТОВКА РАБОЧИХ

Рабочие предприятия "Гроднотекстиль" выставили ультиматум руководству своего предприятия. Подписали ультиматум генеральному директору Виталию Быкову 154 рабочих.

Они потребовали, чтобы им выплатили зарплаты за декабрь и январь. За декабрь с ними рассчитались. За январь деньги также начали выплачивать. Но в бухгалтерии сообщили, что выдать январские зарплаты целиком пока невозможно. Рабочие предупредили, что в таком случае проведут 11 марта предупредительную забастовку.

Радио "Свабода"

МАСТЫ

КАДРАВЫЯ ЗМЕНЫ

У калгасе "Ленінец" адбыўся справаздачна-выбарчы сход. На ім выконваючым абавязкі старшыні гаспадаркі быў абраны Пётр Акулка, які да гэтага часу працаваў у мясцовым упраўленні сельскай гаспадаркі і харчавання.

У гэтай гаспадарцы ён стаў працаваць з пачатку 2002 года і займаў пасаду намесніка старшыні. Былы старшыня калгаса Валянцін Нагуй вяртаецца ў Вялікія Азёркі, дзе ў калгасе "Шчара" зойме пасаду аднаго з вядучых спецыялістаў.

Антон МАКЕЙ

ДЗЕ ЛЮДЗЯМ ПАМЫЦЦА?

Паколькі ў калгасах і саўгасах, а таксама сельсаветах Мастоўскага раёна няма сродкаў на ўтрыманне вясковых лазняў, болей года вялася гутарка аб іх перадачы вытворчаму аб'яднанню жыллёва-камунальнай гаспадаркі, якую ўзначальвае Іван Валюк.

Лазні на вёсцы не працавалі доўгі час, таму кіраўніку прадпрыемства дасталася незайздросная спадчына: прыкладна 45 аб'ектаў бытавога прызначэння, у якіх скрадзены інвентар, прыйшлі ў нягоднасць абсталяванне і памяшканні.

Антон МАКЕЙ

ОБЩЕСТВО

ПОМОЩНИЦА ПРОКУРОРА ИСТЯЗАЛА СВОЕГО СЫНА

Администрация Московского района Минска решила ходатайствовать перед судом в деле лишения родительских прав помощницы прокурора Минского района Тамары Князевой.

Факт избиения ею приемного сына Никиты Князева юристы признают за истязание.

ХАРТИЯ-97

БЕЛОРУССКАЯ ПРИВАТИЗАЦИЯ

По даным Министерства экономики, наибольшее количество объектов реформировано в Гродненской области — 455.

К настоящему времени в Беларуси реформировано 4118 объектов коммунальной собственности с численностью работающих 211,1 тыс. человек. При этом приоритет среди отраслей имеет торговля — в этой сфере приватизировано 1058 объектов (41 процент от общего количества приватизированных), по предприятиям АПК — 479 объектов (18 процентов), по бытовому обслуживанию — 371 объект (14 процентов), по общественному питанию — 239 объектов (9 процентов).

Ирина САЗАНОВИЧ

НАЛОГОВЫЕ ОРГАНЫ НАМЕРЕНЫ БОРОТЬСЯ С ЗАРПЛАТОЙ "В КОНВЕРТАХ"

Налоговые органы Беларуси намерены бороться с фактами выплаты заработной платы "в конвертах", заявил заместитель министра по налогам и сборам Александр Дорошенко.

Основная цель — частные предприятия, так как на государственных предприятиях "достаточно хороший учет и хороший контроль", считает Дорошенко. "В основном это субъекты хозяйствования негосударственной формы собственности, как предприниматели без образования юридического лица, так и юридические лица, которые имеют различные формы собственности, кроме государственной", — подчеркнул Дорошенко.

ХАРТИЯ-97

ОФИЦИАЛЬНАЯ ПРЕССА ОБЪЕДИНЯЕТСЯ В МЕДИА-ХОЛДИНГИ

В Беларуси будут создаваться информационные медиа-холдинги.

Такой выход видит Министерство информации в той экономической ситуации, в которой оказались многие электронные и печатные СМИ.

Речь идет о крупных информационных структурах, которые должны более эффективно использовать бюджетные средства. Реформирование издательского процесса будет сопровождаться объединением отдельных газет и журналов в одно издание. Государственные дотации на поддержку прессы в этом году составят 50-60% от прошлогодней суммы. Количество изданий в текущем году значительно сократится.

ХАРТИЯ-97

НЕУДЕРЖИМЫЕ ЦЕНЫ

По данным Министерства статистики и анализа Беларуси, за первые три недели февраля потребительские цены в стране не выросли на 2,8 процента (за первую неделю — на 1,6, за вторую — на 0,9, за третью — на 0,3).

С начала нынешнего года потребительские цены в Беларуси выросли на 9,1 процента.

БелаПАН

НАУКА

УНИКАЛЬНЫЙ АППАРАТ СДЕЛАЛИ БЕЛОРУССКИЕ УЧЕНЫЕ

Специалистами института физики Национальной академии наук Беларуси (НАНБ) создан уникальный лазерный терапевтический аппарат "Снаг", предназначенный для лечения широкого круга заболеваний и травм.



В интервью БелаПАН старший научный сотрудник Института физики НАНБ Галина Мостовникова подчеркнула, что "ни в Беларуси, ни в России, и, пожалуй, в мире, подобных аппаратов сегодня просто нет".

Области применения аппарата: спортивная и бытовая травматология (растяжения, ушибы, частичные разрывы мышц, повреждения суставов), сердечно-сосудистые заболевания (ишемическая болезнь сердца, гипертоническая болезнь), заболевания опорно-двигательного аппарата, заболевания нервной системы, оториноларингология (тонзиллиты, фарингиты, воспаления придаточных пазух носа и пр.), гинекология и другие заболевания.

Отличительными особенностями нового аппарата являются его небольшие размеры и вес, возможность работы от автономного источника. Самое же главное, по словам Мостовниковой, что в аппарате используется "специальная оптика, обеспечивающая получение коллиматорного (нерасходящегося) лазерного луча", а также "высокая мощность излучения" (до полутора ватт). "При разрыве мышц, сухожилий и лечении многих других заболеваний необходимо, чтобы излучение, плотность и мощность были порядка 100 Мвт на квадратный сантиметр на глубине 6—8 сантиметров. У низкоинтенсивных только единичные фотоны достигают очага поражения из-за сильного отражения от кожи и рассеивания лазерного луча", — пояснила Мостовникова.

В марте, сообщила она, завершаются медицинские испытания аппарата "Снаг", которые сегодня проводятся в БелМАПО (Институт усовершенствования врачей), в Институте неврологии и Диспансере спортивной медицины, где он используется для лечения спортивного травматизма. По словам Мостовниковой, разработчики получают "очень хорошие отзывы" на новый аппарат.

"Мы заключили с Минздравом договор о намерениях", — сообщила Мостовникова. Поставки новых аппаратов в белорусские лечебные учреждения, по ее словам, "могут начаться уже в конце марта".

Ориентировочная оптовая цена нового аппарата — около 500 долларов США.

БелаПАН

ЭКОНОМИКА

ПОДОРОЖАЛИ УСЛУГИ ТАКСИ

В Беларуси вновь выросли тарифы на перевозку пассажиров легковыми такси. Услуги такси подорожали почти на 30 процентов.

Теперь стоимость одного километра пробега и посадки в такси в дневное время (с 6 до 22 часов) составляет 450 рублей (было 350), одного часа простоя при включенном таксометре — 4.500 рублей (ранее 3.500 рублей). В ночное время (с 22 до 6 часов) километр пробега и посадка в такси обойдутся пассажиру в 675 рублей (было 525 рублей), а за один час ночного простоя при включенном таксометре теперь придется выложить 6.750 рублей (было 5.250 рублей). Стоимость одного заказа такси составляет 400 рублей.

БелаПАН

ЗА ФЕВРАЛЬ КВАРТПЛАТА ВЫРОСЛА В 1,8 РАЗА

В феврале 2002 года в Беларуси продолжился рост тарифов на жилищно-коммунальные услуги для населения.

Наиболее заметно — на 82,2 процента (с 12,31 до 22,43 рубля за квадратный метр общей площади) — повысилась квартплата. С начала года квартплата увеличилась на 90,7 процента (за весь 2001 год — на 38,5), электроэнергия подорожала на 25 процентов, отопление и горячая вода — на 15,2, холодная вода и канализация, вывоз и обезвреживание отходов — на 9, газ — на 4,1, плата за пользование радиоточкой возросла на 10,3 процента, лифтом — на 4,7.

БелаПАН

КУЛЬТУРА

ОБЪЯВЛЕН КОНКУРС ДЕТСКОГО РИСУНКА

Отдел сотрудничества и культуры посольства Франции в Беларуси и Белорусский союз художников (БСХ) объявили о проведении в стране конкурса детского рисунка "С любовью к Франции".



Фото Віталя ГІЛЯ

Мероприятие проводится в честь 200-летия со дня рождения писателя Виктора Гюго. Как сообщили БелаПАН во французском посольстве, конкурс проводится среди детей в возрасте от 7 до 18 лет. Его тематика — Франция и Виктор Гюго; его жизнь, произведения, фантазии, герои его книг; Франция во времена Гюго и сегодня.

На конкурс принимаются работы, выполненные на холсте маслом, на бумаге и картоне гуашью, тушью, акварелью, фломастерами или в смешанной технике. Каждая работа сопровождается сведениями о годе создания, технике исполнения и размерах, информацией об авторе. Работы принимаются до 2 мая в посольстве Франции по адресу: 220030, Минск, площадь Свободы, 11. Главным призом для победителя станет поездка во Францию. Кроме того, для участников конкурса предусмотрено 8 поощрительных призов. Лучшие работы будут выставлены в Республиканской художественной галерее со 2 по 14 июля этого года.

Ирина САЗАНОВИЧ

ОБЩЕСТВО

ПРОФСОЮЗЫ ГОТОВЯТСЯ К АКЦИИ ПРОТЕСТА

Общенациональная акция протеста белорусских профсоюзов пройдет 28 марта. Эту дату утвердил президиум Совета Федерации профсоюзов Белорусской (ФПБ) на своем заседании 28 февраля.

Решение провести в конце марта общенациональную акцию протеста было принято 14 февраля в Минске на совещании с участием председателей отраслевых профсоюзов, профкомов крупнейших предприятий страны, областных и городских профобъединений. Акция проводится в связи с ухудшением социально-экономической ситуации в стране и нежеланием властей вести социальный диалог с профсоюзами.

Первоначально акция планировалась на 5 марта, однако от этой даты пришлось отказаться, поскольку, по признанию руководства ФПБ, подготовка к ней во многих первичных организациях велась слабо.

Как сообщил БелаПАН заведующий организационным отделом ФПБ Анатолий Левицкий, официально предстоящее мероприятие называется "общенациональная акция — единый день профсоюзных действий", оно пройдет под лозунгом "Нет росту цен! За достойную жизнь и права профсоюзов!". Место и время проведения акции в Минске пока не определены. Заявка в Мингорисполком, согласно законодательству, должна быть подана не позднее, чем за 15 дней до проведения акции.

Ирина ЛЕВШИНА

ЭКОНОМИКА

ЧИСЛО БЕЗРАБОТНЫХ ПРЕВЫСИЛО 100 ТЫСЯЧ

В январе нынешнего года численность безработных, зарегистрированных в государственных службах занятости, возросла на 6,2 процента и достигла 109,3 тыс.

По данным Министерства статистики и анализа, это составляет 2,4 процента от экономически активного населения. В январе 2001 года безработных было 100,8 тыс., в декабре 2001 года — 102,9 тыс.

Наибольший уровень безработицы по-прежнему сохраняется в восточных областях страны: в Витебской — 3,3 процента (18,9 тыс. человек), в Могилевской — 3 (16 тыс.), в Гомельской — 2,9 (19 тыс.). Далее следуют Гродненская область — 2,7 (13,6 тыс.), Минская — 2,2 (14,1 тыс.), Брестская — 2,2 (14 тыс.) и Минск — 1,5 (13,7 тыс.).

В общей численности безработных женщины составляют 60 процентов, молодежь в возрасте до 30 лет — 52. Общее среднее образование имеет 63 процента безработных, среднее специальное — 15, высшее — 8.

БелаПАН

ЭКОНОМИКА

БУДЕТ ПЕНСИЯ ЧЕТЫРЕХ УРОВНЕЙ

Не пазней 1536 года Зэльва на некаторы час выйшла з-пад улады прыватных рук і зрабілася каралеўскай уласнасцю. У вышэй згаданым 1536 годзе кіраваў горадам Іван Гарнастай, земскі падскарбчы, маршалак літоўскі і, адначасова, стараста слонімскі, які гэтымі тытуламі падпісаў у Вільні пэўныя дакументы, якія тычыліся Зэльвы. Ёсць меркаванне, што быў ён у стане пажыццёвага ўладара, бо не меў нашчадкаў, і ўжо праз год (матэрыялы аб гэтым знаходзяцца ў так званай "Літоўскай метрыцы") Мікалай Пац сілай авалодаў і далучыў да сваёй маёмасці Зэльву з акругай. З гэтай нагоды кароль прызначыў спецыяльных камісараў для разбору інцыдэнту, якім было строга загадана не раз'язджацца да той пары, пакуль не скончаць справу. Камісары і вырашылі праблему такім чынам, што спрэчныя землі сталі каралеўскай уласнасцю.

У пачатку XVII стагоддзя Зэльва зрабілася ўласнасцю слаўнага на Беларусі сваёй дабрачыннасцю і разнастайнай мецэнацкай дзейнасцю роду Сапегаў, але як гэта здарылася і калі — дакладна невядома. У той жа самай вышэйзгаданай Літоўскай метрыцы ёсць дакументы аб тым, што ўжо ў 1632 годзе, незадоўга да смерці, Леў Сапега перадаў Зэльву з усёй нерухомасцю ў спадчыну Яну Казіміру, які, таксама як і сам Леў Сапега, меў тытул "маршалак літоўскі". Той, у сваю чаргу, перад сваёй смерцю, будучы бяздзетным, адпісаў горад малодшаму брату Казіміру Львовічу, падскарбчаму Вялікага Княства.

На працягу гэтага ж XVII стагоддзя Зэльва на некаторы час, на законных падставах, адыходзіла да родзічаў Сапегаў, магнатаў Палюбінскіх, але потым вярнулася да іх у якасці пасагу Ізабэлы Палюбінскай, што ўзяла шлюб з Георгіем Сапегам. Валодалі Зэльвай і Радзівілы, і іншыя ўладары, але амаль заўсёды яна пераходзіла з рук у рукі мірна, часцей — у якасці закладу. Магчыма таму, што ніхто з гаспадароў не затрымліваўся тут на доўгі час, яны не звярталі вялікай увагі на развіццё Зэльвы.

Зорны час яе настаў толькі ў першай палове XVIII стагоддзя, калі сын Антонія Казіміра Сапегі — Аляксандр, сапраўдны дабрадзей горада, сур'ёзна заняўся развіццём Зэльвы. І вынік яго працы можа быць добрым прыкладам нават для сучасных дзяржаўных дзеячоў і прамысловых начальнікаў, узорам таго, чаго магчыма дасягнуць у сферы эканомікі пры разумным кіраванні. Вучыць нас прыклад Зэльвы і таму, як магчыма загубіць справу, калі гаспадарыць чалавек часовы, не ўпэўнены ў заўтрашнім дні, і таму падпарадкуе свае дзеянні жаданню хуткай нажывы, адначасова наносячы непапраўную шкоду ўсёй справе агулам. У гэтым сэнсе беларусы сапраўды могуць ганарыцца феноменам Зэльвы XVIII стагоддзя. Аляксандр Сапега сур'ёзна ўзяўся за развіццё горада, паклаўшы за аснову яго дабрабыту стварэнне Зэльвенскага кірмашу.

Факт існавання Зэльвенскага кірмашу замоўчваўся савецкімі гісторыкамі па зразумелых прычынах, хаця існаваў ён адносна нядаўна — якіх 200 гадоў таму. Справа ў тым, што на яго прыкладзе можна добра прасачыць не толькі тую ролю, што адыграла Расійская імперыя ў заняпадзе эканамічнага і культурнага развіцця нашай Бацькаўшчыны, але і сам факт існавання гэтага кірмашу сведчыў аб ілжывасці эпітэтаў, якімі напоўнены этнаграфічныя працы XIX стагоддзя аб жыхарах беларускіх земляў. Не былі беларусы такімі лайдакамі, выпівохамі і нязграбнымі працаўнікамі, як пісалі ў адпаведных працах расійскія навукоўцы мінулага стагоддзя, жадаючы ўвесці ў галовы людзей прагрэсіўнасць далучэння беларускіх зямель да Расіі. На прыкладзе Зэльвы добра відаць, што адбылося тут на самай справе. З іншага боку, у савецкія часы постаць самога Сапегі праяўляецца тут не ў надта выгадным святле для бяздарных савецкіх кіраўнікоў і не супадае з традыцыйным для савецкай гісторыі вобразам пана-эксплуатататара.

Але вернемся да Зэльвы. 20 траўня 1720 года Антоній Казімір Сапега, бацька Аляксандра Сапегі, атрымаў дазвол на правядзенне кірмашоў і торгаў у дзень св.Троіцы па Грыгарыянскаму календару ў мала каму вядомым мястэчку Зэльва. Амаль праз 20 гадоў, у 1739 годзе, мястэчка, у якасці спадчыны, перайшло да Аляксандра. У той час было ў ім менш за сто двароў. Насельніцтва Зэльвы складалася тады, у асноўным, з сялян-беларусаў ды яўрэяў. Малады Сапега амаль адразу распачаў энергічную дзейнасць па арганізацыі гандлю, не звяртаючы ўвагі на адлегласць Зэльвы ад буйных гарадскіх цэнтраў і гандлёвых шляхоў. І вынікі яго клапатлівай і, галоўнае, разумнай дзейнасці праявіліся ўжо праз некалькі гадоў. Найбольшага ж росквіту зэльвенскі гандаль дасягнуў у другой палове таго ж стагоддзя. У "Гандлёвым дзённіку" сярэдзіны другой паловы XVIII стагоддзя аб горадзе напісана: "....акрамя штотыднёвых таргоў, існуе чатырохтыднёвы кірмаш, які пачынаецца 4 жніўня. Каля 200 крамаў, пабудаваных у квадрат, не маглі змясціць усіх тавараў, калі прыязджалі купцы з розных, нават вельмі далёкіх краінаў". Існуе меркаванне, што Зэльвенскі кірмаш быў другім у Еўропе па багаццю тавараў, тавараабароту і колькасці купцоў пасля Лейпцыгскага. Галоўным і самым прэстыжным таварам на ім былі коні. Купіць каня ў Зэльве — значыла тады купіць вельмі добрага і дарагога каня. Іх колькасць, што прапаноўвалася на продаж, дасягала некалькіх тысяч. Табун самога Аляксандра Сапегі адрозніваўся сваёй шматлікасцю і якасцю. Ён налічваў больш за тысячу коней англійскай, турэцкай, датскай і неапалітанскай пародаў. У сярэдзіне другой паловы XVIII стагоддзя тавараабароты кірмашу дасягалі астранамічных сумаў у некалькі мільёнаў злотых. На яго збіраліся не толькі гандлёвыя людзі — наязджалі сюды для забаў багацеі і авантурысты з усіх краінаў Еўропы, прыходзілі са славутай Смаргонскай акадэміі дрэсіроўшчыкі са сваімі танцуючымі мядзведзямі, цыганы і іншы люд.

Безумоўна, буйныя памеры Зэльвенскага кірмашу не маглі не паўплываць на эканамічнае развіццё ўсяго рэгіёну. Напрыклад, нездарма Вялікі гетман Літоўскі Міхаіл Казімір Агінскі (вядомы мецэнат, драматург, кампазітар, валадар суседняга Слоніма) пачаў пракладваць вядомы канал Агінскага, які злучыў рэкі Ясельду са Шчарай і тым самым раку Неман Балтыйскага басейна звязаў з ракой Прыпяць, якая ўпадае ў Чорнае мора.

Гэта не толькі аблегчыла дастаўку тавараў у Зэльву з Еўропы і з сярэднеземнаморскіх гарадоў, але і дало магчымасць закласці ў Слоніме буйныя аптовыя склады, наладзіць інфраструктуру для прыёму купцоў і адпраўкі іх з таварамі ў Зэльву і праводзіць свае ўласныя кірмашы...


Пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, калі Зэльва, у ліку іншых беларускіх гарадоў, адышла да Расійскай імперыі, кірмашовыя справы адразу пайшлі на ніз, бо былі абкладзеныя новымі гаспадарамі вялікімі падаткамі. А пасля канфіскацыі маёмасці ў Сапегаў у 1832 годзе, за падтрымку антырасійскага паўстання 1831 года, і ўвогуле заняпалі, пазбаўленыя разумнага кіравання. Новая ўлада, губляючы на вачах даходы, спрабавала зрабіць нешта, але меры гэтыя былі вартыя нават не смеху, а рогату. Напрыклад, для барацьбы з барышнікамі ўлады даслалі афіцэра з 30 салдатамі, назначылі павятовага лекара на выпадак хваробы каго-небудзь з гандлюючых і гэтак далей. Перасталі прыязджаць купцы з дзіўнымі заможнымі таварамі, і ўжо ў саракавыя гады XIX стагоддзя кірмаш ператварыўся ў звычайны вясковы рынак.

Андрэй ПЯТЧЫЦ,
Рым

Газета Слонімская
7 — 13 сакавіка 2002г. №10 (248)

СУСТРЭЧА

ДЗВЕ ГАДЗІНЫ СА СЛАВАМІРАМ АДАМОВІЧАМ



Славамір Адамовіч

"Напярэдадні свайго 40-годдзя я зразумеў тры рэчы, якія рухаюць чалавекам у жыцці. Гэта прага матэрыяльнага дабрабыту ці, прасцей кажучы, грошай, прага ўлады і прага любові, кахання..." — прызнаўся на мінулым тыдні беларускі паэт, празаік і публіцыст Славамір Адамовіч падчас сустрэчы з наведвальнікамі літаратурна-музычнай гасцёўні Слонімскай раённай бібліятэкі.

У Слонім паэт прывёз дзве свае апошнія кнігі: зборнік выбранай лірыкі "Плавільшчыкі расы" 1999 года выдання і "Турэмны дзёньнік", якія пабачыў свет у мінулым годзе. Разам са Славамірам Адамовічам у наш горад прыязджала спявачка, выканаўца песень на яго вершы, Вікторыя Ільінская. Паслухаць сталічных гасцей прыйшлі настаўнікі, навучэнцы медвучылішча, мясцовыя літаратары і проста аматары прыгожага пісьменства. І, мабыць, сімвалічна, што абсалютную большасць прысутных складалі жанчыны. Бо асноўнай тэмай сустрэчы была паэзія, а дакладней — лірыка кахання. А ў гэтым жанры Славамір Адамовіч, без перабольшвання, — прызнаны майстра. Паэт эпатажу, "дзікі" паэт, "свядомы ідыёт" і... як толькі яшчэ не называлі Адамовіча крытыкі і калегі па паэтычнаму цэху за яго "экстрэмізм" у творчасці і жыцці. Але высокую мастацкую вартасць і бязмежную шчырасць, адкрытасць яго паэзіі прызнавалі і прызнаюць усе, хто не глухі да паэтычнага слова. Вершы з шостай кніжкі паэзіі "Плавільшчыкі расы", па-майстэрску агучаныя аўтарам, не пакінулі раўнадушным і слонімскага чытача. Апладысменты суправаджалі таксама і кожную песню пад гітару Вікторыі Ільінскай.



У зале бібліятэкі падчас сустрэчы з паэтам

Ужо стала традыцыяй, што падчас такіх сустрэч у літаратурнай гасцёўні аўдыторыя не абыходзіць пісьменнікаў пытаннямі. Не стаў у гэтым плане выключэннем і Славамір Адамовіч. Тым больш, што ён адносіцца да тых аўтараў, чыя творчасць самым цесным чынам пераплятаецца з асабістым лёсам, з біяграфіяй. І, мабыць, крыху нечаканым быў адказ паэта на пытанне "У чым Вы бачыце сэнс жыцця?", калі Адамовіч сказаў, што бачыць яго ва ўменні радавацца, знаходзіць насалоду нават у звычайных жыццёвых дробязях. А з іншага боку, чалавек, які адсядзеў 10 месяцаў у турме (фармальна за верш, а фактычна за палітычныя погляды і грамадскую дзейнасць), можа быць, як ніхто іншы ведае кошт гэтым самым дробязям жыцця.

Калі зайшла размова пра стан беларускай мовы, паэт выказаўся досыць коратка і канкрэтна: "Пакуль паэты і пісьменнікі будуць пісаць па-беларуску так добра, як я і яшчэ лепш — будзе і мова."... Камусьці пасля такіх слоў можна было б улічыць у нясціпласці, але толькі не Славаміра Адамовіча. Бо на ніве беларушчыны яго словы не разыходзяцца са справай, а ў літаратуры ў паэта свая, зусім адметная ад іншых, творчая дзялянка. У чым і мелі магчымасць пераканацца слонімскія аматары паэзіі за тыя дзве гадзіны, што правялі ў кампаніі са Славамірам Адамовічам.

"Усё, чаго я дасягнуў у паэзіі і літаратуры, што сапраўды нечага варта і што я цаню, стала магчымым, дзякуючы каханню да жанчыны," — падагуліў свае творчыя набыткі паэт напрыканцы сустрэчы і прачытаў на развітанне верш "Будзем". Бо, сапраўды, на гэтай зямлі мы былі, ёсць і будзем.

Мікола КАНАНОВІЧ

ПАЭЗІЯ

Іван
ЦІМАФЕЙЧЫК

Ўзаўюцца ўвысь напевы беларусаў

У родны край,
што слаўны ратнай сілай,
дзе ссечаны варожыя сцягі
(й палі буйнелі зернем неблагім!),
прыйшла бяда —
пагрозай і засіллем...
Куды ні глянь! Пыхлівая навала,
сагнаўшая свабоды галасы
(з аздобаю "братэрства" —
для красы),
каварствам тым
мой край апанавала.

Ды веру я: світанак кіне промні,
трывогі кліч
прайграе вецер вольны...
З-пад шэрані мярзотнага абрусу
(насустрач праўдзе,
сонцу і вясне!),
ва ўсёй сваёй пышчоце і красе,
ўзаўюцца ўвысь
напевы беларусаў.

НАВІНЫ

З "ВЕТРАКОМ" ПА ЖЫЦЦІ

Нядаўна пабачыў свет сёмы нумар бюлетэню "Вятрак" аднайменнага творчага маладзёжнага аб'яднання з вёскі Мірная Слонімскага раёна.

Гэты нумар выдання, у параўнанні з папярэднім, "патаўсцеў" з чатырох да васьмі старонак фармату А-4. Цяпер кожная паласа бюлетэню мае сваю назву. З'явіліся такія тэматычныя старонкі як "Усё для Беларусі", "Школьнае жыццё", "Літаратурная старонка", "Гістарычная спадчына".

У выданні прадставілі свае матэрыялы Алег Шэлестаў, Валерый Сакалоў, Ульяна Трафімец і Іван Літвінаў.

Наклад бюлетэню складае 299 паасобнікаў і распаўсюджваецца сябрамі аб'яднання бясплатна.

Мікола КАНАНОВІЧ

ТАЛЕНТ

БЕЛАРУСАЧКА

Калі яна ўсміхаецца, здаецца, што засвяціла сонейка. Ласкавая, абаяльная, мілая Юля Дзірвук з'яўляецца гонарам Дзятлаўскай СШ №1.

Жыве дзяўчынка ў вёсцы Агароднікі, якую ад райцэнтра аддзяляюць каля дзесяці кіламетраў, і дабіраецца на заняткі на аўтобусе. Яна ўмее радавацца жыццю, прыкмячае ў ім усё самае цікавае, непаўторнае і стараецца перадаць гэта ў вершах і прозе. Калі напярэдадні Трэцяга з'езда беларусаў свету Міжнароднае грамадскае аб'яднанне "Бацькаўшчына" аб'явіла конкурс "Беларусь — мая Бацькаўшчына", Юля вырашыла ў ім паўдзельнічаць. І была вельмі ўзрадавана, калі з Мінска прыйшло пісьмо, а ў ім такая прыемная навіна: "Віншуем Вас! Вы сталі адным з пераможцаў конкурсу і ўзнагароджаны пуцёўкай на адпачынак у Балгарыю тэрмінам на два тыдні". Але Юля ў Балгарыю не паехала. Яна сказала бацькам і настаўнікам: "Мне яшчэ рана выязджаць за мяжу. Я вельмі люблю сваю родную Беларусь, але ведаю пра яе зусім мала. Калі ў мяне там спытаюць пра мінулае роднага краю, яго гісторыю, знакамітыя мясціны, наўрад ці змагу адказаць правільна."

Усе былі здзіўлены такімі разважаннямі юнай беларусачкі, а бацькі вырашылі, што ў час летніх канікул звозяць яе па знакамітых мясцінах роднага краю: наведаюць Мірскі замак, Дом-музей Адама Міцкевіча ў Навагрудку і іншыя.

За творчыя поспехі ад згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына" Юля атрымала і другую ўзнагароду — кнігу "Гістарычны шлях Беларускай нацыі і дзяржавы", выдадзеную ў Мінску. А хутка ў вёску Агароднікі на імя Юлі Дзірвук прыйшла бандэроль, а ў ёй — зборнік твораў пераможцаў конкурсу. Трыццаць юных аўтараў жывуць у розных кутках Беларусі. Ёсць у гэтым зборніку і сачыненне нашай зямлячкі. Гэты твор заслугоўвае таго, каб з ім пазнаёміліся і чытачы "ГС".

Леанарда ЮРГІЛЕВІЧ



Юлія Дзірвук

Беларусь — мая Бацькаўшчына

Для кожнага беларуса той куток, дзе ён нарадзіўся, самы любы, дарагі. Кожнаму гэты куток застаўся ў спадчыну ад дзядоў і прадзедаў, а таму мы, беларусы, любім сваю радзіму моцна, так, як можа любіць яе толькі беларус. Вось і я нарадзілася ў невялічкай вёсачцы. Тут і птушкі спяваюць асабліва весела, і вецер цёплы і лагодны, тут кветкі і травы маюць асабліва духмяны водар, здаецца, што і сонейка тут цяплейшае і ласкавейшае.

Люблю вас, родныя куточкі,
І дом, і вёску, і сям'ю.
Як маці любіць сваю дочку,
Так і радзіму я люблю.
З дзяцінства мне знаёма рэчка,
З дзяцінства мне знаёмы луг,
І смак чырвонае парэчкі,
І поле, дзе прайшоўся плуг.
Люблю я пах ржаного хлеба,
Што маці раніцай пякла,
І спеў дзяўчат, што ліўся з неба
З майго радзімага сяла.

Прыход вясны я чакаю з хваляваннем, бо нараджэнне новага — гэта пачатак жыцця. Я люблю ўпрыгожваць сваю сядзібу, садзіць кветкі і даглядаць іх.

Ля свайго акенца
Пасаджу бярозку —
У беленькай сукенцы,
Тоненькія коскі.
У цябе касічкі —
У мяне касічкі.
Бярозка, бярозка,
Мы ж з табой сястрычкі.

А якія прыгожыя вясновыя вечары! Кружыць галаву пах чаромхі і першых вясновых кветак. Сэрца растрывожваюць салаўіныя трэлі. Дзіву даешся, як такая маленькая птушачка ў адно імгненне можа закрануць струны душы і прымусіць іх то плакаць, успомніўшы мінулае, то радавацца, што наперадзе яшчэ ўсё жыццё і столькі можна зрабіць, каб не пражыць яго дарэмна.

Эх, пяе, пяе салоўка!
Бы дзяўчына-чарнаброўка
З васількоў вянок сплятае, —
Гэтак слаўна ён спявае.
Сціхне песенька, і ў сэрцы
Вянок блакітны застанецца
З тых васількоў
і песні салаўінай,
Што праплывае
над маёй радзімай.

Цудоўная ў Беларусі восень! Прыход восені — гэта асаблівае хараство. Колькі ў лесе розных фарбаў! Колькі прыгожага і чароўнага можна ўбачыць наўкола. Хаця б той самы рознакаляровы дыван з лісцяў, што ляжыць на зямлі. Як ён мяне вабіць сваім патаемным шэптам! А смачныя журавіны на балоце! Восенню ападаюць лісточкі з дрэваў, вецер іх нясе і нясе недзе далёка. А ў паветры яны трымцяць, нібы развітваюцца са мной, з прыродай. У цёплыя краіны адлятаюць птушкі. Сярод іх і журавы. Яны даўно кружаць над роднымі мясцінамі, не хочуць з імі развітвацца.

Восень, восень залатая,
Ты удаліца такая.
Малявала ты ля вёскі
Жоўтым колерам бярозкі.
На дрыготкую асінку
Начапіла павуцінку.
А ў лесе ля пянькоў
Панасаджвала грыбкоў.
На балоце пад ялінай
Насяліла журавінаў.
У лесе пабываць я рада,
Назбіраць грыбоў і ягад,
Каб зімой на печ залезці
І са смакам усё з'есці.

А самая прыгожая пара года — зіма. Столькі хараства, казак! Мне вельмі падабаецца, як выпадзе снег і на дрэвах, на пнях, на дахах ляжаць снежныя шапкі. Дзе больш можна ўбачыць такое хараство, як не ў Беларусі! А звяры! У іх ужо таксама пачынаецца новае жыццё: хто заваліўся спаць да вясны, хто шукае, чым пажывіцца.

Вось і прыйшла жаданая
Зіма доўгачаканая.
На двары мароз трашчыць,
На зямлі сняжок ляжыць.
Ёлачка зялёная
Ад холаду дрыжыць.
Галінкі ў снег захутвае,
Каб зімачку пражыць...

Вось такой я ўяўляю сваю Бацькаўшчыну: цёплай, прыгожай, сінявокай. Колькі ўсяго яна пабачыла на сваім вяку!

Вайна... Загінуў амаль кожны чацвёрты жыхар Беларусі, было разбурана шмат гарадоў і вёсак. І гэта яшчэ не ўсё... Чарнобыль... Колькі людзей загінула! Колькі маляўнічых куточкаў засталося пустымі, недаступнымі для людзей.

Рэчка бруіцца
з пясчанымі берагамі.
У ёй камень ляжыць
з цяжкімі бакамі.
У сэрцы людскім
такі камень ляжыць.
З чорным Чарнобылем
як жа нам жыць?

Юлія ДЗІРВУК

ЮБИЛЕЙ

"КАМЕРАТЕ" 10 ЛЕТ

В пятницу, в первый день весны, в Слонимской детской музыкальной школе отмечали 10-летний юбилей хорового коллектива "Камерата". Руководителем "Камераты" является Наталья Куклицкая.

Поздравить хор с праздником приехали гости из Гродно, Лиды.

Хор "Камерата" был организован в 1992 году из учащихся 4-7 классов хорового отделения Слонимской детской музыкальной школы. Сразу же в репертуар хора было включено 15 произведений различны стилей и жанров: русская и зарубежная классика, современная музыка, произведения белорусских композиторов.

С 1993 года хор начинает активную концертную деятельность, а 20 марта 1993 года становится победителем городского конкурса хоровых коллективов "Жаваранaчкі".

В 1996 году решением коллегии Министерства культуры РБ за достигнутые успехи в развитии художественного творчества хору "Камерата" присваивается звание образцового. Творческий коллектив успешно выступал не только в нашей стране, но и в Польше. Например, в сентябре 1999 года хор "Камерата" принимал участие в конкурсе религиозной песни в польском городе Хелме. Жюри конкурса присудило хору 11 место.


На сегодняшний день в репертуаре "Камераты" более 100 произведений различных жанров.

Ольга ШИНКЕВИЧ


Газета Слонімская
7 — 13 сакавіка 2002г. №10 (248)

ЛЕГКАЯ АТЛЕТИКА

ТЕПЕРЬ И ЗИМА ЛЕГКОАТЛЕТАМ НИПОЧЕМ



Награждение призеров соревнований



Первая на финише Инна Борисик (СШ №2, на снимке — слева)

В день открытия легкоатлетического манежа в Слониме состоялись и первые соревнования королевы спорта в закрытом помещении. Наш город принимал открытое первенство Гродненской области.

Кроме команд городов и районов Принеманья в Слоним приехали и спортсмены из Барановичей и Светлогорска. Все участники командных соревнований были разбиты на три межрегиональные группы. В первой — Волковыск, две команды Гродно, Лида, Сморгонь и Слоним. Во второй были представлены команды Лидского, Дятловского, Кореличского, Мостовского, Новогрудского, Ошмянского и Щучинского районов. В третьей — легкоатлеты Вороновского, Зельвенского, Ивьевского, Островецкого и Слонимского районов.

Начались соревнования забегами на 60 м. Здесь среди мальчиков первенствовал Николай Нестеров (Сморгонь), а среди девочек — Ирада Джангирова (Гродно). Наша Татьяна Лугина (СШ №5) стала второй.

На дистанции 60 метров с барьерами среди девочек все три призовых места взяли спортсменки Барановичей: Ольга Холеич, Ольга Хилько и Настя Булдакова. У мальчиков же победил Иван Крищик (Волковыск). На втором месте — Сергей Шлемин (Сморгонь), а на третьем — Андрей Чудук (Барановичи).

Слонимские ребята более успешно выступили на других дистанциях. На тысячеметровке Денис Ляшевич (СШ №8) поднялся на третью ступеньку пьедестала почета. Среди девочек на этой же дистанции первой была Наталья Гриневич, второй — Катя Венская (обе из Гродно), третьей — Анна Ольховик (Мосты). В забеге на 300 м слонимчанин Евгений Яговдик (СШ №8) стал третьим, а Татьяна Лугина (СШ №5) вновь чуть-чуть не дотянула до первого места.

Блестяще выступила воспитанница Слонимской районной ДЮСШ Марина Сучко (д. Шиловичи, УОР г. Гродно). В спортивной ходьбе она выиграла дистанции на 1 и 2 километра.

По результатам личных выступлений спортсменов определились и команды-призеры во всех трех группах. В первой победила команда Сморгони, второе место — Слоним, третье — Гродно(1). Во второй группе впереди оказались ребята Новогрудского района, вслед за



Пока судьи записывают результаты, есть время отдохнуть и настроиться на следующую дистанцию

ними — мостовчане, а на третьем месте — команда Дятловского района. В третьей группе первые три места поделили между собой легкоатлеты Островецкого (I), Слонимского (II) и Зельвенского (III) районов.

Соревнования удались и стали праздником не только для юных легкоатлетов, но и для всего Слонима. Да и области, пожалуй, поскольку такой манеж — единственный в Гродненской области. Теперь все зимние первенства по легкой атлетике будут проводиться в нашем городе.

Все это подтвердили и присутствовавшие на открытии манежа высокие гости: заместитель начальника управления министерства спорта и туризма Николай Бабец, главный тренер республиканского центра физического воспитания и спорта, заслуженный мастер спорта и заслуженный тренер Беларуси Дарья Чернышева, неоднократный чемпион СССР, чемпион Европы, участник Олимпийских игр Михаил Желобовский.

К открытию такого нужного городу и детям Слонима манежа, правда, пришлось пройти путь длиной в 10 лет. Причем городской бюджет, по словам директора СДЮШОР №3 Леонида Малофея, не вложил в это строительство ни копейки.

Манеж был построен при помощи костела св. Андрея и наполовину облисполкомом. Причем, само здание на деньги католической церкви было отстроено буквально



Указания тренера по ходу дистанции

за год, а все остальные работы не выдерживают критики ни по качеству, ни по срокам их выполнения. Именно по этой причине на открытие манежа строители приглашены не были.

Ну, а все остальное покажет время и спортивные результаты слонимских мальчишек и девчонок, которые получили действительно долгожданный подарок — легкоатлетический манеж.

Валерий КОВАЛЕНКО, фото Виталия ГИЛЯ

ФУТБОЛ. ЧЕМПИОНАТ МИРА-2002

НА ЧЕМПИОНАТЕ МИРА ПО ФУТБОЛУ ЗАПРЕТИЛИ АЛКОГОЛЬ

Организаторы футбольного чемпионата мира в Японии и Южной Корее решили провести турнир под знаком борьбы с пьянством среди болельщиков.

По решению оргкомитета, у входа на каждую футбольную арену будут созданы так называемые "посты общественного контроля", на которых всех пришедших на матч болельщиков заставят "дуть в трубочку". Если уровень содержания алкоголя в крови фаната окажется выше допустимого, он не будет допущен на трибуну.

"Не секрет, что большинство нарушителей порядка во время матчей находятся в нетрезвом состоянии. В отношении болельщиков, которые вздумают прийти на стадион в подобной кондиции, будут применяться самые строгие меры", — указывается в специальном заявлении организаторов.

В частности, как удалось узнать, пьяных болельщиков планируется наказывать так же строго, как и пьяных водителей. Причем "пьяным" с 1 июня будет считаться тот, в чьей крови содержание алкоголя будет превышать 15 мг/л, что соответствует одной бутылке пива.

Реакция Международной федерации футбольных ассоциаций (FIFA) на данную инициативу организаторов ЧМ-2002 пока неизвестна. Однако вряд ли такие драконовские меры по отношению к болельщикам будут одобрены, сообщает Daily Soccer.

NTVRU.com

ШАШКІ

ЛЕПШЫЯ ШАШЫСТЫ — У СШ №8

На мінулым тыдні ў сярэдняй школе №10 прайшлі спаборніцтвы на першынство Слоніма ў праграме клуба "Цуда-шашкі".

Адзінаццаць каманд школ горада, у склад якіх уваходзілі па чатыры юнакі і дзве дзяўчыны 1986 года нараджэння і маладзейшыя, змагаліся за званне чэмпіёна. Акрамя пераможцы турніру чэмпіянат павінен быў вызначыць і склад зборнай каманды Слоніма да ўдзелу ў абласных спаборніцтвах. У выніку ўпартай барацьбы за шашачнымі дошкамі першае месца занялі шашысты СШ №8 (Юрый Сегель, Максім Кандзіранда, Дзяніс Ярашэвіч, Юрый Курцэвіч, Вольга Клімаўцова і Алена Саламевіч). Толькі на адно ачко адстала ад пераможцаў каманда СШ №9, а на трэцім месцы даволі нечакана апынуліся шашысты санаторнай школы-інтэрната.

У склад зборнай Слоніма на чэмпіянат вобласці ўвайшлі ўсе самыя моцныя шашысты: Юрый Курцэвіч і Максім Кандзіранда з СШ №8, Андрэй Мацявін (СШ №9) і Кацярына Амагамедава (СШ №10).

Яўген ІВАНОЎ

ЛЁГКАЯ АТЛЕТЫКА

ДРУГОЕ МЕСЦА ПА РЭСПУБЛІЦЫ

Напрыканцы лютага ў Брэсце адбыліся рэспубліканскія спаборніцтвы па легкаатлетычных кіданнях.

Другое месца ў кіданні молата з вынікам 45 метраў 72 сантыметра заняла на чэмпіянаце Таццяна Цімафейчык (Жыровіцкая СШ).

У слонімскай раённай спецыялізаванай ДЮШАР яна займаецца пад кіраўніцтвам трэнера Сяргея Дзямідзіка.

Валерый КАВАЛЕНКА

ШАШКІ

КОНКУРС РАШЭННЯЎ ШАШАЧНЫХ ПАЗІЦЫЙ


З гэтага нумара "ГС" прапануе сваім чытачам, аматарам шашак, конкурс рашэнняў шашачных пазіцый.

Усяго будзе 12 заданняў: камбінацыйныя канцоўкі, эцюды і эцюдныя заканчэнні. Пераможцы конкурсу будуць адзначаны прызамі.

Заданне №1

Белыя:
простыя b4, c3, d4, e1, f2, h4 (6).
Чорныя:
простыя a2, c7, e7, f4, f6, g5 (6).
Белыя пачынаюць і выйграюць.

Адказы дасылайце на адрас рэдакцыі "ГС" з паметкай "шашкі".




Яўген ІВАНОЎ

ШАХМАТЫ

РАЗМІНКА ПЕРАД СТАРТАМ


З наступнага нумара "ГС" распачне конкурс на лепшае рашэнне шахматных задач і эцюдаў. Лепшыя рашэнні будуць адзначаны прызамі слонімскага шахматнага клуба.

А сёння ў якасці размінкі прапануем аматарам шахмат трохходоўку: Ф. Гігольд, 1952 г.
Белыя: Кр e3, В a4, С c3, С e6, пп. f2, h2.
Чорныя: Кр g5, пп. e4, e7, h5.
Белыя пачынаюць і ставяць мат у тры хады.



Уладзімір ЛІЦЬВІН

прогноз погоды




Информация предоставлена сайтом www.meteo.by

на 6 - 13 марта

Дата	6		7	
Время суток	ночь	день	ночь	день
Температура, С	4	6	4	8
Скорость ветра, m/sec	5	4	2	8
Дата	8		9	
Время суток	ночь	день	ночь	день
Температура, С	3	4	4	10
Скорость ветра, m/sec	8	8	4	5
Дата	10		11	
Время суток	ночь	день	ночь	день
Температура, С	5	5	0	9
Скорость ветра, m/sec	5'	5	1	1
Дата	12		13	
Время суток	ночь	день	ночь	день
Температура, С	0	9	4	10
Скорость ветра, m/sec	1	3	3	1

Кроссворд ЧислОвой

ОТ Дмитрия Трофимовича



В клетках кроссворда написано только одно начальное число — 19 845.
Остальным числам, приведённым ниже, нужно найти место в сетке кроссворда.

❷ 02, 93; ❸ 374, 036, 000, 125, 128, 453; ❹ 5663, 9636, 1332, 8325; ❺ 30207, 51933, 02295, 31816, 13394, 96326, **19845**, 45449, 78601, 28206, 95321, 74514, 53760, 36064, 70399, 05684, 00103, 00837, 53891, 53087; ❼ 5322230, 5013625, 6730077, 2785489, 8307057, 2538069, 2063995, 3771059, 1705652, 2711086; ❾ 002151611, 432097415.

анекдоты

☺ 😐 ☹

Усама бен Ладен на экскурсии в Италии осматривает достопримечательности. Дойдя до Пизанской башни, задумывается и, усмехаясь, произносит:
- Дилетанты!

☺ 😐 ☹

- Далеко отсюда пивная?
- Как сказать... Десять минут - туда, и около часа - обратно.

☺ 😐 ☹

Зеркало - это средство общения с умным человеком.

☺ 😐 ☹

Разговор двух мужчин.
- У нее ноги, как у газели.
- Что, такие стройные и тонкие?
- Нет, такие же волосатые.

☺ 😐 ☹

Разговор двух подруг:
- Никогда больше я не пойду с мужем ловить рыбу!
- А что случилось?
- Сначала я, оказывается, громко разговаривала, затем нацепила не ту наживку, потом слишком рано подсекла.
- Ну, а дальше?
- Кончилось совсем скверно: я наловила рыбы больше, чем он.

☺ 😐 ☹

- Сегодня я расскажу вам, как стать душой компании! Для этого вам потребуется пузырь водки и... И, пожалуй, все:!

ОТВЕТЫ НА кроссворд (№247)

По горизонтали
7. Матушкин. 8. Санников. 10. Финиш. 11. Саади. 12. Мелихов. 15. Видмар. 18. Лондон. 19. Сыман. 20. Шпак. 21. Буре. 23. Мозер. 25. Карпов. 26. Хоккей. 31. Фетисов. 33. Парад. 34. Панов. 35. Скабелка. 36. Воронков.

По вертикали
1. Валиулин. 2. Журик. 3. Минаев. 4. Панков. 5. Финал. 6. Богданов. 9. Яшин. 13. Шабанов. 14. Логунов. 16. Быков. 17. Салей. 22. Байдарка. 24. Невзоров. 27. Мехико. 28. Ринг. 29. Борзов. 30. Шайба. 32. Раунд.

ГОРОСКОП НА НЕДЕЛЮ

от www.iqnio.com

Неделя принесет творческое вдохновение, Вы почувствуете прилив энергии, практически все замыслы будут удаваться. Вам необходимо взяться за решение назревших проблем. Понедельник лучше посвятить завершению незаконченных дел и подведению итогов. Во вторник сконцентрируйтесь на главном, а второстепенные дела пока немного подождут. Свою стремительность и воинственность лучше придержать до четверга, хотя, на первый взгляд, она может придавать Вам особый шарм. В четверг, по возможности, сократите рабочий день до разумного минимума; интуиция подскажет, как лучше закончить этот день, наполненный мистикой и ощущением обновления, и, конечно, не забудьте о праздничных подарках.

ОВЕН

Не желательно браться за новые проекты или давать согласие на участие в каких-то авантюрах. Будьте осторожнее, есть опасность в определенных ситуациях переоценить свои силы. Постарайтесь не бегать от ответственности в рабочих делах. Вам никто не предлагает решать их в одиночку. От Вас требуется только одно: не сваливать на других то, что будет возложено на Вас. В понедельник на работе вероятна конфликтная ситуация. Ближе к середине недели Вам, может быть, придется задуматься о своем месте в жизни.

ТЕЛЕЦ

Большая вероятность успехов в карьере и личной жизни. Но не стоит спешить и избирать девиз "все или ничего". Сначала необходимо доказать свои права реальным делом. Не забудьте поддержать идеи начальства и не скупитесь на полезные советы сослуживцам. Если Вы учитесь, не забывайте об учебе. Она, конечно, не всегда так приятна, как нежные взгляды, но пользы от нее все-таки гораздо больше. И помните: немногословность в определенных ситуациях может творить чудеса. Во вторник Вы можете достичь блестящих результатов на работе, а среда и четверг способствуют успешности в деловых переговорах и подписании договоров.

БЛИЗНЕЦЫ

Чтобы добиться желаемого результата, Вам необходимо: проявлять инициативу, вносить творческие предложения, не портя при этом отношения с начальством, сохранять взаимопонимание с коллегами по работе. Постарайтесь не впадать в крайности. Гордыня наказуема, посему мысли о том, что Вас недостаточно ценят, лучше гнать сразу, прежде чем за них станет стыдно. Однако и излишняя жертвенность ни к чему - это может вызвать взрыв накопившихся эмоций, поэтому лучше держаться золотой середины.

РАК

Старайтесь не тратить драгоценное время впустую. Все задуманное сможет исполниться, если Вы спокойно и четко будете делать свое дело. Прежде чем составлять план действий, стоит проверить надежность партнеров, можно ли на них положиться. Во второй половине недели Вы можете почувствовать, что Вы на многое способны, однако лучше сосредоточиться на самом главном, а мелочи не упускайте из поля зрения. В понедельник желательно быть незаметным и избрать выжидательную позицию. Четверг может оказаться самым созидательным днем недели, а выходные порадуют приятными событиями.

ЛЕВ

На этой неделе Вам может не понравится то, что будет происходить вокруг Вас, но постарайтесь не делать поспешных выводов, чтобы не усугублять ситуацию, будьте вежливы, дипломатичны и интеллигентны. Придется рассчитывать только на свои силы. Для достижения желаемого результата необходимо учитывать интересы партнеров. Благоприятное время для заключения сделок, подписания документов. В понедельник будут легко улаживаться юридические дела.

ДЕВА

Вам необходимо собраться с силами и одним рывком справиться с накопившимися наболевшими проблемами. Попытки наладить отношения с коллегами по работе увенчаются успехом и помогут предотвратить затяжной конфликт. Постарайтесь не транжирить попусту силы, связи и деньги. Вам кажется, что Вы имеете совсем немного и того, и другого, и третьего, но если Вы не научитесь бережно относиться к тому, что есть, большего Вы не приобретете. Нежелательно переходить на другое место работы.

ВЕСЫ

Доверьтесь Вашей интуиции и идите бесстрашно вперед. Дела на работе не вызывают особого беспокойства, но не стоит подпускать к себе лень на близкое расстояние, иначе Вы ощутите ее коварство в полный рост. Пом-ните, что противоречия являются движущей силой Вашего развития. Начиная со вторника, личная жизнь выходит на первый план. В Вашу жизнь хлынут новые знакомые, почти неиссякаемым потоком. В конце недели наступит время для избавления от вредных привычек.

СКОРПИОН

Вы - творец своего счастья, не упустите это золотое время. Вы сможете оказаться на гребне волны, если того искренне пожелаете. Не распыляйтесь, поставьте себе конкретную цель и стремитесь к ее достижению. Во вторник вероятна встреча с другом, которая подарит Вам новые возможности. Благоприятное время для поиска вариантов обмена квартиры или переезда. Вы можете понадобиться родственникам, если это возможно, проведите праздник у них. На этой неделе Вам будет способствовать удача в денежных делах. В четверг возможны новые денежные поступления.

СТРЕЛЕЦ

Вы упорно продвигаетесь к намеченной цели. Не жалейте времени на встречу с друзьями и общение с природой. Постарайтесь использовать благоприятное время для новых знакомств, налаживания необходимых контактов и связей. К Вам придет своевременно необходимая информация, связанная с работой, постарайтесь ее не пропустить. В отношениях с близкими людьми иногда бывает важнее не сколько мы для них делаем, а что делаем. Не путайте количество с качеством. Не забывайте о походах в театры, на концерты и на выставки.

КОЗЕРОГ

На этой неделе Ваши задачи будут связаны с четкостью, поэтому Ваши мысли должны быть стройны как колонны в храме. Вы в состоянии решить свои проблемы сами, и начать здесь нужно с того, чтобы, по крайней мере, не создавать излишних проблем другим - сразу станет легче жить. Не прибедняйтесь, Ваша энергия бьет ключом, причем во всех направлениях. Пора воплощать на практике давно взлелеянную мечту, у Вас все получится. В понедельник будут удачны поездки и дальние командировки. С пятницы на субботу могут быть вещие сны.

ВОДОЛЕЙ

Вы в центре внимания, одно из блистательных украшений зодиака. Грамотный подход к делу и уверенность в своих силах обеспечит Вам успех. Если Вам удалось хорошо наладить текущие дела, это еще не значит, что можно расслабиться. Наоборот, теперь самое время взяться за что-нибудь более серьезное. Кто не двигается вперед, тот катится назад. С дальними поездками лучше повременить. Вероятны творческие озарения, прислушивайтесь к своей интуиции, и фортуна будет к Вам благосклонна.

РЫБЫ

Газета Слонімская
Рэг. нумар 947 ад 24.03.1997г.

ГАЛОЎНЫ РЭДАКТАР Віктар ВАЛАДАШЧУК
ЗАСНАВАЛЬНІК Віктар ВАЛАДАШЧУК

Адрас рэдакцыі:
231800, г.Слонім, вул. Камсамольская, 8.
Тэлефоны:
рэдакцыі 2-14-39
..........(017)210-81-80
аддзел рэкламы 2-49-39

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць асабістую адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў, іх меркаванні могуць не супадаць з поглядам рэдакцыі.
Рэдакцыя не вядзе перапіску з чытачамі і пакідае за сабою права рукапісы не рэцэнзаваць і не вяртаць.
Рэдакцыя таксама не адказвае за змест рэкламы.

Падпісана да друку
5 сакавіка 2002г.
Час падпісання 7:00.
Надрукавана
ў Гродзенскім абласным унітарным прадпрыемстве "Слонімская друкарня", г.Слонім, вул. Хлюпіна, 16.
Газета друкуецца на беларускай і рускай мовах.

Падпісныя індэксы:
64042 (індывідуальная)
63818 (ведамасная)
63646 (льготная)

ЗАКАЗ № 736

E-MAIL: gs@irex.minsk.by **HTTP:**//gs.promedia.minsk.by **Аб'ём — чатыры друкаваныя аркушы**

